УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ЗБОР ДАКУМЕНТАЎ ДЗЕЯЧАЎ МАСТАЦТВА

**1992–2011**

**ФОНД № 374**

**ВОПІС № 2**

**1949–1994 гг.**

МІНСК 2024

# ЗМЕСТ

**да воп. № 2　　　　　ф. 374**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ М.Л. БЕЛЬСКАГА | 1-14 | 1-3 |
| 1.1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.Л. БЕЛЬСКАГА І ІНШ. | 1-5 | 1 |
| 1.2. | ДАКУМЕНТЫ МАСТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ М.Л. БЕЛЬСКАГА | 6-10 | 1-2 |
| 1.3. | ДАКУМЕНТЫ ВЫКЛАДЧЫЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Л.М. БЕЛЬСКАГА І АБ ІМ | 11-14 | 2-3 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ М. ПАШКОЎСКАЙ (Л.І. МІРОНАВАЙ) | 15-68 | 3-8 |
| 2.1. | СЕРЫЯ АРХІТЭКТУРНЫХ ПЕЙЗАЖАЎ М. ПАШКОЎСКАЙ | 15-52 | 3-6 |
| 2.2. | АРХІТЭКТУРНЫЯ ПЕЙЗАЖЫ М. ПАШКОЎСКАЙ І ІНШ. | 53-68 | 6-8 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ І.П. РЭЯ | 69-102 | 8-11 |
| 3.1. | ПАРТРЭТЫ І.П. РЭЯ | 69-86 | 8-9 |
| 3.2. | ПЕЙЗАЖЫ І КАМПАЗІЦЫІ І.П. РЭЯ І ІНШ. | 87-102 | 9-11 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ | 103-127 | 11-15 |
| 4.1. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ | 103-105 | 11 |
| 4.2. | ДАКУМЕНТЫ СЛУЖБОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ В.А. ТРЫГУБОВІЧ | 106-118 | 11-14 |
| 4.2.1. | ПЕРАПІСКА ПА РАБОЧЫХ ПЫТАННЯХ І ІНШ. | 106-115 | 11-13 |
| 4.2.2. | ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ У ЧАСОПІСЕ "МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ" | 116-118 | 13-14 |
| 4.3. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ В.А. ТРЫГУБОВІЧ ПА ЦІКАВЫХ ТЭМАХ | 119-127 | 14-15 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ І.Б. ЭЛЕНТУХА | 128 | 15 |

## Прадмова

У выніку навукова-тэхнічнага апісання быў складзены вопіс № 2 у колькасці 128 спраў (495 дакументаў) за 1949–1994, якія паступілі ў БДАМЛМ у 1992–2011 гадах. Вопіс складаецца з 4 раздзелаў, сістэматызаваных па алфавіце прозвішчаў фондаўтваральнікаў, унутры раздзелаў – адпаведна прынятай у БДАМЛМ схемы.

Першы раздзел прадстаўлены дакументамі мастака-графіка **Бельскага Міхаіла Лявонцьевіча**, якія паступілі ў БДАМЛМ у 2011 годзе ад Сяргея Мікалаевіча Казлоўскага (уладальніка асабістага архіва). М.Л. Бельскі нарадзіўся 21 верасня 1921 года ў горадзе Сянно Віцебскай вобласці. У 1941 годзе скончыў Днепрапятроўскае мастацкае вучылішча. У 1941–1945 гг. быў на фронце. У 1946–1952 гг. вучыўся ў Кіеўскім дзяржаўным мастацкім інстытуце (цяпер – Нацыянальная акадэмія выяўленчага мастацтва і архітэктуры) у І.М. Пляшчынскага і А.А. Шаўкуненкі. З 1947 года ўдзельнічаў у мастацкіх выставах у Кіеве. У 1952–1956 гг. выкладаў у Мінскім мастацкім вучылішчы (цяпер – Мінскі дзяржаўны мастацкі каледж імя А.К. Глебава), у 1956–1987 гг. – у Беларускім палітэхнічным інстытуце (цяпер – Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт). Памёр 29 красавіка 1988 года.

З 1954 года сябра Саюза мастакоў БССР. Працаваў у станковай і кніжнай графіцы, у тэхніцы акварэлі, афорту, літаграфіі і ксілаграфіі.

Раздзел прадстаўлены трыма падраздзеламі. У першым сабраны творчыя дакументы мастака М.Л. Бельскага і інш., у другім і трэцім – дакументы мастацкай і выкладчыцкай дзейнасці М.Л. Бельскага і інш. Справы сістэматызаваны па відах дакументаў, унутры відаў – па храналогіі за 1954–1985 гады.

Другі раздзел складаюць дакументы мастачкі **Макрыны Пашкоўскай** (сапраўднае імя Людміла Іванаўна Міронава), перададзеныя ў БДАМЛМ ёй самой у 1996 годзе. Макрына Пашкоўская нарадзілася ў 1946 годзе ў горадзе Шаўляй (Літва) у сям'і служачага, скончыла сярэднюю школу, радыётэхнічны інстытут. [Пераехала ў Мінск]. У 1982 годзе, у 36 год, пачала займацца ў студыі выяўленчага мастацтва ў Мікалая Яфімавіча Цурыкава, затым – у Вадзіма Аляксандравіча Муравіцкага. Адначасна вучылася на пяцігадовых мастацкіх курсах жывапісу і графікі, фарміравалася пад уплывам мастакоў Яўгена Сяргеевіча Куліка і Аляксея Антонавіча Марачкіна[1]. Яе галоўная творчая тэма – архітэктурны, пераважна мінскі гарадскі, пейзаж. Жыве ў Мінску[2].

Раздзел складаецца з двух падраздзелаў з дакументамі за 1971–1996 гг. У першым – "Серыя архітэктурных пейзажаў М. Пашкоўскай" – справы складзены адпаведна спіса прац аўтара. У другім – "Архітэктурныя пейзажы М. Пашкоўскай і інш." (сюды ўвайшлі графічныя працы мастачкі, яе

---

[1] БДАМЛМ, Ф. 374, Воп. 2, Спр. 67: "Аўтабіяграфія М. Пашкоўскай", Л. 2.

[2] У часопісе "Маладосць" змешчана інтэрв'ю Макрыны Пашкоўскай Алесю Карлюкевічу (№ 3, 2008, уклейка паміж 112 і 113 старонкамі).

фатаграфіі і інш.) – справы сістэматызаваны па відах дакументаў, унутры аднаго віду – па храналогіі.

Трэці раздзел прадстаўлены дакументамі мастака-жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР **Рэя Івана Пятровіча,** яны паступілі ў БДАМЛМ у 2003 годзе ад яго калегі па Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь – мастацтвазнаўцы Людмілы Дзмітрыеўны Налівайка. І.П. Рэй нарадзіўся 11 ліпеня 1930 года ў вёсцы Падбулькава Брэсцкай вобласці. У 1952 годзе скончыў Іванаўскае мастацкае вучылішча (цяпер – Іванаўскае мастацкае вучылішча імя М.І. Малюціна), У 1959 годзе атрымаў дыплом жывапісца ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў), з таго ж года ўдзельнічаў у мастацкіх выставах. У 1962–1965 гг. выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, затым [працаваў у Дзяржаўным мастацкім музеі БССР] (цяпер – Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь). Памёр 20 жніўня 2002 года.

Працаваў у станковым жывапісу, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. У 1988 годзе атрымаў званне “Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР”, у 2001 годзе ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Раздзел мае два падраздзелы: “Партрэты, намаляваныя І.П. Рэем,” і “Пейзажы і кампазіцыі, намаляваныя І.П. Рэем, і інш.”. Справы ў іх сістэматызаваны па жанрах твораў мастака, а ўнутры жанраў – па храналогіі за 1949–1975 гг.

Чацвёрты раздзел складаюць дакументы мастацтвазнаўцы, журналісткі, грамадскай дзяячкі **Трыгубовіч Валянціны Андрэеўны**, яны паступілі ў БДАМЛМ ад яе самой у 1992 годзе. В.А. Трыгубовіч нарадзілася 13 студзеня 1947 года ў Бабруйску ў сям’і служачага. У 1964–1967 гадах працавала ў газеце “Слава працы” ў горадзе Капыль. У 1970 годзе скончыла факультэт журналістыкі БДУ. У 1970–1983 гадах працавала ў газеце “Голас Радзімы”, з 1983 года была загадчыцай аддзела выяўленчага мастацтва часопіса “Мастацтва Беларусі” (цяпер – часопіс “Мастацтва”). Жыве ў ЗША.

З 1975 года – сябра Саюза журналістаў Беларусі, з 1988 года – Беларускага саюза мастакоў. У 1989–1996 гадах – сябра Сойма Беларускага народнага фронту, у 1989–1995 гадах – старшыня камісіі партыі па замежных сувязях. У 1992 годзе – адна з ініцыятараў стварэння праваслаўнага брацтва ў гонар Віленскіх мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія пры Свята-Петра-Паўлаўскім саборы ў Мінску. У 1995 годзе – сябра савета заснавальнікаў грамадскага навукова-аналітычнага цэнтра “Беларуская перспектыва”, з кастрычніка 1998 да [1999] года – адна з трох старшыняў цэнтра, з сакавіка 1998 года – рэдактар аднайменнага бюлетэня.

Раздзел прадстаўлены 3 падраздзеламі: “Асабістыя дакументы В.А. Трыгубовіч”, “Дакументы службовай дзейнасці В.А. Трыгубовіч” і “Дакументы, сабраныя В.А. Трыгубовіч па цікавых тэмах”. Справы ў іх сістэматызаваны па намінальна-храналагічным прынцыпе за 1976–1992 гг.

Пяты раздзел прадстаўлены дакументамі мастацтвазнаўцы **Элентуха Ізраіля Барысавіча**[3]. Гэта складзеныя па храналогіі паштоўка і пісьмы І.Б. Элентуха і яго дачкі (1990–1993, Ізраіль) да Т.Б. Грушэцкай (Беларусь).

Прадмову склала
Заг. аддзела В.Ф. Шаталава
07.05.2024

[3] Біяграфічныя звесткі гл. у прадмове да вопісу № 1.

Установа “Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва”

ЗАЦВЕРДЖАНА

ФОНД № 374
ВОПІС № 2
1949–1994

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 23.05.2024
№ 5

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ М.Л. БЕЛЬСКАГА** | | | | |
| | **1.1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ М.Л. БЕЛЬСКАГА І ІНШ.** | | | | |
| 1 | М.Л. Бельскі. Жаночыя і мужчынскія партрэты, лясныя пейзажы. Альбом з замалёўкамі і накідамі. Акварэль, аловак, пяро, туш | 1954 | 31 | 1/36 | |
| 2 | М.Л. Бельскі "Апошняе падполле", "Будаўніцтва вежаў для хавання цэменту", "З салдатамі рэвалюцыі", "Зямля і мір" і інш. Рэпрадукцыі малюнкаў і ілюстрацый. Выразкі з [друкаванага] і перыядычных выданняў, часопіс "Бярозка" (№ 1 за 1957 г. і № 8 за 1963 г.) | 1957-1970 | 50 | 7/21 | |
| 3 | М.Л. Бельскі. Ілюстрацыі да твора А.С. Пушкіна "Казка пра цара Салтана" (1955), паэмы Я. Коласа "Рыбакова хата" (1957), вершаў і паэмаў Я. Купалы (1957-1958) і інш. Альбом з рэпрадукцыямі і фатаграфіямі. На Л. 3 - спіс ілюстрацый (машынапіс) | [кан. 1950-х гг.] | 74 | 1/34 | |
| | *** | | | | |
| 4 | Спісы мастацкіх прац М.Л. Бельскага за 1953-1987 гады і інш. Аўтограф, сшытак з аўтографам, машынапіс з дапіскамі М.Л. Бельскага | | 26 | 6 | |
| | *** | | | | |
| 5 | Віншавальныя паштоўкі Беларускага палітэхнічнага інстытута, Саюза мастакоў СССР і інш. М.Л. Бельскаму з 25-й і 40-й гадавінамі перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне | 1970-1985 | 8 | 3 | |
| | **1.2. ДАКУМЕНТЫ МАСТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ М.Л. БЕЛЬСКАГА** | | | | |
| 6 | Акты Дзяржаўнага мастацкага музея БССР аб прыёме на часовае захаванне і набыцці мастацкіх твораў М.Л. Бельскага і інш. | 1956-1982 | 7 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | М.Л. Бельскага | | | | |
| 8 | Дыплом II ступені Беларускага рэспубліканскага конкурсу на лепшыя па мастацка-тэхнічным афармленні і паліграфічным выкананні кнігі М.Л. Бельскаму за мастацкае афармленне кнігі І. Гурскага "На берагах Нявы" | 1968 | 3 | 1 | |
| 9 | Выпіскі з пратакола сумеснага пасяджэння кафедры архітэктуры і кафедры малюнка, акварэлі і скульптуры, партыйнага камітэта і інш. Беларускага палітэхнічнага інстытута па пытанні хадайніцтва аб прысваенні М.Л. Бельскаму звання "Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР" | 1968 | 6 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 10 | Разліковы лісток, даведка і паведамленні адміністрацыі Мінскага мастацка-вытворчага камбіната і інш. М.Л. Бельскаму па ўмовах аплаты арэнды творчай майстэрні | 1962-1985 | 4 | 4 | |
| | **1.3. ДАКУМЕНТЫ ВЫКЛАДЧЫЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Л.М. БЕЛЬСКАГА І АБ ІМ** | | | | |
| 11 | Характарыстыкі адміністрацыі Беларускага палітэхнічнага інстытута на выкладчыка (старэйшага выкладчыка, выконваючага абавязкі дацэнта і дацэнта) М.Л. Бельскага для прадастаўлення ў Вышэйшую атэстацыйную камісію Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і інш. | 1963 - [ад 1970 г.] | 11 | 6 | |
| 12 | Граматы і ганаровыя граматы Беларускага рэспубліканскага Савета ветэранаў вайны, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Саюза архітэктараў БССР і інш. М.Л. Бельскаму за актыўную ваенна-партыятычную работу сярод насельніцтва, шматгадовую навукова-педагагічную і грамадскую дзейнасць і інш. | 1966-1975 | 11 | 8 | |
| 13 | Дакументы аб зацвярджэнні метадычнага дапаможніка М.Л. Бельскага па курсу "Малюнак"-"Пленэр" (водгукі рэцэнзентаў, выпіскі з пратакола пасяджэння кафедры "Малюнка, акварэлі і скульптуры" і метадычнай камісіі архітэктурнага факультэта Беларускага палітэхнічнага інстытута) | 1985 | 7 | 7 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 14 | Артыкулы пра і са згадкай М.Л. Бельскага, біяграфічная даведка пра яго.<br>На Л. 11 - рэпрадукцыі малюнкаў М.Л. Бельскага да артыкула З. Бандарынай "Па Купалаўскіх мясцінах" (5).<br>Машынапіс з праўкай неўстаноўленай асобы, машынапіс, выразка з часопіса "Бярозка" | 1955-1971 | 11 | 4 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ М. ПАШКОЎСКАЙ (Л.І. МІРОНАВАЙ)** | | | | |
| | **2.1. СЕРЫЯ АРХІТЭКТУРНЫХ ПЕЙЗАЖАЎ М. ПАШКОЎСКАЙ** | | | | |
| 15 Нест. | М. Пашкоўская "Верхні горад. Менск. Будаўніцтва метро ў б. кляштара бернардзінак", "Верхні горад. Менск. З боку Траецкай гары". Малюнкі.<br>Папера, карычневы аловак, фламастэр | 1985, 1988 | 2 | 2 | |
| 16 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Бернардзінскі мужчынскі кляштар з касцёлам Св. Язэпа". Малюнак.<br>Папера, сангіна | 1987 | 1 | 1 | |
| 17 | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Кляштар бернардзінцаў з боку вул. Герцэна". Малюнак.<br>Папера, цёмна-карычневы аловак | 1988 | 1 | 1 | |
| 18 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Дворык базыліянскага жаночнага кляштара (у час рэканструкцыі)". Малюнак.<br>Папера, карычневы соус | 1989 | 1 | 1 | |
| 19 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна з боку вул. Гандлёвай". Малюнак.<br>Папера, карычневы соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 20 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вуліца Герцэна". Малюнак.<br>Папера, сангіна | 1989 | 1 | 1 | |
| 21 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна ад вул. Гандлёвай".<br>Папера, пастэль, соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 22 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна".<br>Фотапапера, сангіна, соус | 1987 | 1 | 1 | |
| 23 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск (у час рэканструкцыі). На Музычны зав., 1 і вул. Герцэна з боку дворыка базыльянак". | 1989 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Папера, пастэль,соус | | | | |
| 24 Нест. | М. Пашкоўская "Верхні горад. Менск. Будынак на рагу вул. Герцэна, 2 і Музычнага зав., 1", "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна, 2, 4, 6 - у час рэканструкцыі". Малюнкі.<br>Папера, карычневы аловак, фламастэр | 1988, 1994 | 2 | 2 | |
| 25 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Дворык па вул. Герцэна, 2". Малюнак.<br>Папера, карычневы соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 26 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Будынак на рагу вул. Герцэна, 2 і зав. Музычнага, 1 (інтэр'ер I паверха)". Малюнак.<br>Папера, карычневы соус | 1989 | 1 | 1 | |
| 27 Нест. | "Верхні горад. Менск. Дворык паміж вул. Герцэна і Музычным зав. З будынкам № 2а (знішчаны ў 1987 годзе)". Малюнак.<br>Фотапапера, карычневы соус, сангіна | 1987 | 1 | 1 | |
| 28 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Будынак па Музычнаму зав., 1 - інтэр'ер". Малюнак.<br>Папера, аловак | 1988 | 1 | 1 | |
| 29 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Дворык з будынкам № 2а па вул. Герцэна".<br>Папера, сангіна | 1987 | 1 | 1 | |
| 30 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна (з боку доміка № 4)". Малюнак.<br>Папера, карычневы соус | 1987 | 1 | 1 | |
| 31 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Герцэна, 4 (дворык)", "Верхні горад. Стары Менск. Дворык на вул. Герцэна №№ 2а і 4". Малюнкі.<br>Папера, акварэль, цёмна-карычневы аловак | 1987, 1988 | 2 | 2 | |
| 32 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Будынак № 4 па вул. Герцэна з боку дворыка". Малюнак.<br>Папера, вугаль, пастэль | 1989 | 1 | 1 | |
| 33 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Музычны завулак з боку ракі Свіслач". Малюнак.<br>Кардон, чорная тэмпера | 1987 | 1 | 1 | |
| 34 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. Музычны зав. з боку р. Свіслач". Малюнак.<br>Папера, фламастэр | 1994 | 1 | 1 | |
| 35 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Вул. Гандлёвая ў | 1987 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Менску". Малюнак. Папера, сангіна | | | | |
| 36 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Вул. Інтэрнацыянальная, 33 і 31". Малюнак. Папера, сангіна | 1990 | 1 | 1 | |
| 37 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Пляц Волі, 19 і 21 (дворык з бэзам)". Малюнак. Папера, вугаль | 1987 | 1 | 1 | |
| 38 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. Пляц Волі, №№ 2 і 4 дворык". Малюнак. Папера, соус | 1987 | 1 | 1 | |
| 39 | М. Пашкоўская. "Менск. Дворык паміж вул. Нямігай і вул. Рэвалюцыйнай". Малюнак. Папера, сангіна | кан. 1980-х гг. | 1 | 1 | |
| 40 | М. Пашкоўская "Менск. Вул. Замкавая" і "Менск. Вул. Замкавая №№ 35, 33, 31, 29", "Менск. Дворык паміж вул. Нямігай і вул. Рэвалюцыйнай, 12". Малюнкі. Папера, аловак, фламастэр | 1984-1987 | 3 | 3 | |
| 41 Нест. | М. Пашкоўская. "Ракаўскае прадмесце. Менск. Вул. Замкавая - будаўніцтва метро ў раёне вул. Вызвалення". Малюнак. Папера, шэры соус | 1987 | 1 | 1 | |
| 42 Нест. | М. Пашкоўская "Ракаўскае прадмесце. Менск. Пякарня на вул. Ракаўскай", "Ракаўскае прадмесце ў Менску. Зав. Заслаўскі - драўляны будынак (фрагмент)" і інш. Малюнкі. Папера, карычневы аловак, фламастэр | 1984/1985-1988 | 4 | 4 | |
| 43 | М. Пашкоўская. "Ракаўскае прадмесце. На рагу вул. і зав. Дзімітрава ў Менску". Малюнак. Кардон, вугаль, крэйда | 1980-я гг. | 1 | 1 | |
| 44 | М. Пашкоўская. "Ракаўскае прадмесце. Менск. Дворык на вул. Дзімітрава, 21". Малюнак. Папера, вугаль, крэйда, пастэль | 1990 | 1 | 1 | |
| 45 Нест. | М. Пашкоўская "Менск. Ракаўскае прадмесце. Дом на рагу вул. Дзімітрава і зав. Дзімітрава (з боку дворыка)", "Ракаўскае прадмесце ў Менску. Зав. Дзімітрава, 7" і інш. Малюнкі. Папера, аловак, туш | 1986 - 1980-я гг. | 3 | 3 | |
| 46 Нест. | М. Пашкоўская. "Ракаўскае прадмесце. Менск. | 1986/1987 | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дворык па зав. Дзімітрава, 7". Малюнак.<br>Папера, шэры соус | | | | |
| 47 | М. Пашкоўская "Ракаўскае прадмесце. Заслаўскі завулак у Менску", "Ракаўскае прадмесце. Менск. Заслаўскі завулак з боку вул. Заслаўскай". Малюнкі.<br><br>Мягкі карычневы кардон, папера, аловак, пяро, туш | 1984, 1988 | 2 | 2 | |
| 48<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Ракаўскае прадмесце. Менск. Заслаўскі завулак, 7". Малюнак.<br>Папера, сангіна | 1987 | 1 | 1 | |
| 49<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Старажоўская брама ў Менску". Малюнак.<br>Папера, аловак | 1987 | 1 | 1 | |
| 50<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Старажоўскія могілкі: брама і перабудаваны храм". Малюнак.<br>Папера, крэйда, пастэль, соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 51 | М. Пашкоўская. "Менск. Зав. Берсана, 5 - з боку дворыка". Малюнак.<br>Папера, вугаль | 1988 | 1 | 1 | |
| 52 | М. Пашкоўская. "Менск. Зав. Берсана". Малюнак.<br>Папера, аловак | 1988 | 1 | 1 | |
| | **2.2. АРХІТЭКТУРНЫЯ ПЕЙЗАЖЫ М. ПАШКОЎСКАЙ І ІНШ.** | | | | |
| 53<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Ракаўскае прадмесце. Зав. Заслаўскі (знесены ў 1989 г.)". Малюнак.<br>Папера, сангіна, соус | [1985] | 1 | 1 | |
| 54<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. Дворык па вул. Герцэна, № 2а (з контрафорсам) і № 4 (з аркай)". Малюнак.<br>Папера, пастэль, соус | 1987 | 1 | 1 | |
| 55<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. На месцы зруйнаванага будынка № 2а па вул. Герцэна". Малюнак.<br>Папера, вугаль | 1987 | 1 | 1 | |
| 56 | М. Пашкоўская. "Менск. Вул. Герцэна №№ 4, 6, 8 - у Верхнім горадзе". Малюнак.<br>Папера, вугаль | 1987 | 1 | 1 | |
| 57<br>Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. Пляц Волі, № 4 (дворык)". Малюнак.<br>Папера, вугаль | [1987] | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 58 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Ракаўскае прадмесце. Вул. Дзімітрава, № 23 - з боку дворыка". Малюнак. Папера, пастэль, соус | [1987] | 1 | 1 | |
| 59 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. Дворык на Пляцу Волі №№ 19 і 21 - у час будаўніцтва метро (2-я лінія)". Малюнак. Папера, пастэль, соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 60 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад у Менску, з боку р. Свіслач". Малюнак. Папера, крэйда, пастэль, сангіна, соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 61 | М. Пашкоўская "Менск, вул. Гандлёвая, будынкі был. кляштара бернардзінцаў" і "Музычны зав., 1". Малюнак і рэканструкцыя. Папера, аловак, акварэльныя алоўкі | 1988 | 2 | 2 | |
| 62 Нест. | М. Пашкоўская. "Верхні горад. Менск. На рагу вул. Герцэна і Музычнага зав.". Малюнак. Папера, пастэль, соус | 1989 | 1 | 1 | |
| 63 Нест. | М. Пашкоўская. "Менск. Верхні горад. Дворык па вул. Бакуніна № 5". Малюнак. Папера, карычневы соус | 1988 | 1 | 1 | |
| 64 | М. Пашкоўская "Гародня", "Краявід". Пейзажы. Лінарыты | 1994 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 65 | М. Пашкоўская "Верхні горад. Менск. Бернардзінскі мужчынскі кляштар (да рэстаўрацыі) з касцёлам Св. Язэпа і з гандлёвымі радамі "віленчукамі", "Верхні горад. Менск. Дворык паміж вул. Герцэна, 2 і Музычным завулкам, 1 (XVIII-XIX ст.ст.)" і інш. Фатагарафіі | 1976 - [1970-я гг.] | 6 | 6 | |
| 66 | Картатэка (фатаграфіі (кантролькі) і апісанне) архітэктурных помнікаў і будынкаў Мінска (Верхні горад, Траецкае прадмесце і інш.) М. Пашкоўскай. Спіс прыкладзеных фатаграфій (ксеракопія аўтографа М. Пашкоўскай) [1970-я гг.] | 1971-1978, [1970-я гг.] | 33 | 1/19 | |
| | *** | | | | |
| 67 | Аўтабіяграфія М. Пашкоўскай. Аўтограф | 1996 | 2 | 1 | |
| 68 | Спіс мастацкіх прац, перададзеных М.Пашкоўскай у дар у БДАМЛМ. | 1996 | 8 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Аўтограф | | | | |

### 3. ДАКУМЕНТЫ І.П. РЭЯ

### 3.1. ПАРТРЭТЫ І.П. РЭЯ

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 69 Нест. | І.П. Рэй. Партрэт Аляксандра Васькова, дзіцячы і мужчынскія партрэты. Эскізы і накіды.<br>Папера, аловак.<br>На адвароце Л. 2 - накід партрэта Марка Твэна (аловак) [1950-я гг.], на адвароце Л. 6 - накід пейзажа (пяро, туш) [1950-я гг.] | 1949 - [1950-я гг.] | 9 | 9/11 | |
| 70 | І.П. Рэй. Партрэт Жэні Гарынай, жаночыя партрэты. Эскізы і накіды.<br>Папера, аловак, аловак з дамалёўкай белай пастэльлю, карычневы аловак.<br>На адваротах Лл. 1 і 12 - накіды жаночых партрэтаў (3) (аловак), Лл. 5 і 10 - накіды мужчынскіх партрэтаў (3) (аловак), Л. 14 - накіды шапак і інш. (аловак) (1954 - [1950-я гг.]) | 1949-1954, [1950-я гг.] | 14 | 14/23 | |
| 71 | І.П. Рэй. Жаночыя і мужчынскія партрэты і інш. Альбом з замалёўкамі і накідамі.<br>Аловак | 1949 | 16 | 1/29 | |
| 72 | І.П. Рэй. Мужчынскія партрэты. Эскізы і накіды.<br>Папера, аловак.<br>На адвароце Л. 5 - накід мужчынскага партрэта (аловак) [1950-я гг.] | 1954-1955, [1950-я гг.] | 10 | 10/14 | |
| 73 Нест. | І.П. Рэй. Жанчына, якая спіць. Накід.<br>І.П. Рэй. Мужчыны, якія спяць. Накіды.<br>Папера, аловак, фламастэр.<br>На Л. 2 - [карыкатуры І.П. Рэя на мастакоў] (2) (фламастэр) [1960-я - 1970-я гг.] | 1955-1975 | 8 | 8/11 | |
| 74 | І.П. Рэй. Жаночыя і мужчынскія партрэты і інш. Альбом з замалёўкамі і накідамі.<br>Аловак, сіні аловак, пяро, туш | 1956 - [1950-я гг.] | 33 | 1/81 | |
| 75 | І.П. Рэй. Партрэт жанчыны-мадэлі ню. Накід.<br>Папера, вугаль | [1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| 76 | І.П. Рэй. Партрэты жанчын-мадэляў ню і інш. Накіды.<br>Папера, аловак | [1950-я гг.] | 4 | 4 | |
| 77 Нест. | І.П. Рэй. Жаночы партрэт. Эскіз.<br>Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 78 | І.П. Рэй. Жаночы і групавы партрэты. Эскізы.<br>Папера, змешаная тэхніка.<br>На адвароце Л.1 - накід жаночай фігуры (аловак), на адвароце Л. 2 - накіды людзей (вугаль) | [1960-я - 1970-я гг.] | 2 | 2/5 | |
| 79 Нест. | І.П. Рэй. Жаночыя і мужчынскія партрэты. Эскізы і малюнкі.<br>Папера, акварэль | [1960-я - 1970-я гг.] | 6 | 6 | |
| 80 Нест. | І.П. Рэй. Жаночыя і мужчынскі партрэты. Эскізы.<br>Папера, паспарту, залітае гуашшу, акварэль з дамалёўкай бяліламі і гуашшу, гуаш<br>На адвароце Л. 2 - накід працуючага тэлевізара (аловак) [1960-я - 1970-я гг.] | [1960-я - 1970-я гг.] | 4 | 3/4 | |
| 81 Нест. | І.П. Рэй. Партрэт жанчыны ў нацыянальным строі. Эскіз.<br>Папера, вугаль | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 82 Нест. | І.П. Рэй. Партрэт жанчыны сталага веку.<br>Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 83 Нест. | І.П. Рэй. Партрэты людзей. Накіды.<br>Папера, пэндзаль, пяро, туш.<br>На адвароце Л. 3 - накід жаночай і мужчынскай фігураў у час язды на лыжах (аловак) | [1960-я - 1970-я гг.] | 3 | 3/5 | |
| 84 Нест. | І.П. Рэй. Мужчынскі партрэт. Эскіз.<br>Папера, пастэль | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 85 Нест. | І.П. Рэй. Мужчынскі партрэт. Эскіз.<br>Папера. пастэль | [1960-я -1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 86 Нест. | І.П. Рэй. Мужчынскі партрэт. Эскіз.<br>Папера, пастэль | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |

### 3.2. ПЕЙЗАЖЫ І КАМПАЗІЦЫІ І.П. РЭЯ І ІНШ.

Пейзажы

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 87 Нест. | І.П. Рэй. Александраўскі сквер (фрагмент) з відам на краму № 13 (праспект Леніна, 23). Малюнак.<br>Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 88 Нест. | І.П. Рэй. Александраўскі сквер (фрагмент) з відам на Палац культуры прафсаюзаў, вёска Кісялі і інш. Накіды.<br>Папера, аловак, каляровыя алоўкі, пэндзаль, туш | [1960-я - 1970-я гг.] | 6 | 6 | |
| 89 Нест. | І.П. Рэй. Вясковы пейзаж. Малюнак.<br>Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 90 Нест. | І.П. Рэй. Вяковы пейзаж. Малюнак. Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 91 Нест. | І.П. Рэй. Вясковы і гарадскія пейзажы. Эскіз і малюнкі. Папера, акварэль, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 4 | 4 | |
| 92 Нест. | І.П. Рэй. Калгасны двор у час збору ўраджаю (розныя часткі) і фрагмент с/х тэхнікі. Накіды. Папера, аловак | [1960-я - 1970-я гг.] | 3 | 3 | |
| | Кампазіцыі | | | | |
| 93 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з жанчынамі, нацюрморт з чэрапам. Малюнкі. Папера, акварэль | [1960-я - 1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| 94 | І.П. Рэй. Кампазіцыя з дзяўчынай. Кардон, алей | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 95 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з людзьмі. Папера, алей. На адвароце Л.1 - партрэт Ф.Э. Дзяржынскага (аловак) | [1960-я - 1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| 96 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з жанчынай. Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 97 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з жанчынай і мужчынай. Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 98 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з людзьмі. Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 99 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя з людзьмі. Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| 100 Нест. | І.П. Рэй. Кампазіцыя са знічом. Малюнак. Папера, змешаная тэхніка | [1960-я - 1970-я гг.] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 101 Нест. | В.К. Гуткевіч, А. Мацвеюк (вучні І.П. Рэя). Партрэты мужчын-мадэляў ню. Эскізы. Папера, аловак | [1970-я гг.] | 2 | 2 | |
| 102 Нест. | Казлоўскі (вучань І.П. Рэя). Партрэт мужчыны-мадэлі ню. Эскіз. Папера, сангіна | [1970-я гг.] | 1 | 1 | |

## 4. ДАКУМЕНТЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **4.1. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ** | | | | |
| 103 | Запрашальныя білеты на мастацкія выставы С.Ц. Андруховіча, Л.С. Антымонава, М.І. Атраховіча, В.Э. Бартлава, М.З. Беляніцкага, А.А. Бембеля і інш. на імя В.А. Трыгубовіч | 1983-1991 | 60 | 32 | |
| 104 | Запрашальныя білеты і каталог мастацкіх выстаў, прысвечаных 175-годдзю з дня нараджэння В. Дуніна-Марцінкевіча (1983), 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны (1986), 150-годдзю з дня нараджэння К. Каліноўскага (1988) і інш.; вечар памяці пісьменніка і мовазнаўцы Ф.М. Янкоўскага, адкрыццё тэатральнага сезона і інш. на імя В.А. Трыгубовіч | 1983-1992 | 47 | 24 | |
| 105 | Анкета ўдзельніка ўстаноўчай канферэнцыі ГА Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", асабовая картка госця ІІ з'езда ТБМ імя Францішка Скарыны, паведамленне дэлегату VII з'езда Саюза журналістаў БССР і інш. на імя В.А. Трыгубовіч | 1987-1990 | 4 | 4 | |
| | **4.2. ДАКУМЕНТЫ СЛУЖБОВАЙ ДЗЕЙНАСЦІ В.А. ТРЫГУБОВІЧ** | | | | |
| | **4.2.1. ПЕРАПІСКА ПА РАБОЧЫХ ПЫТАННЯХ І ІНШ.** | | | | |
| 106 | Пісьмы загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч да аўтараў артыкулаў і інш. у Беларусь, Латвію і [Літву].<br>Чарнавікі | 1984-1990 | 23 | 24 | |
| 107 | Паштоўкі і пісьмы аўтараў артыкулаў С.Ц. Абрамава (2), В. Арловай, Л.С. Арцімонава (6), П.І. Бітэля, М.А. Гугніна і інш. да загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч.<br>Да пісьма М.А. Гугніна прыкладзена фота габелена С.П. Урублеўскай "Витебск" (1985). - Л. 19; да пісьма А.Ф. Кавалёва - яго праект "Перестройка художественного образования в Белоруссии" (машынапіс) і чарнавік яго пісьма са зваротам да Яўгена Міхайлавіча са згадкай гэтага праекта (аўтограф) (1988) - Лл. 26-36 | 1984-1988 | 36 | 17 | |
| 108 | Паштоўка і пісьмы аўтараў артыкулаў А. Касінец (Косінец), А.А. Концуба, Ф.Л. Лейтман (2), А.С. Рамановіча, М.А. Ткачова (2) і інш. да загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч | 1985-1987 | 31 | 18 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | *** | | | | |
| 109 | Паштоўкі і пісьмы мастакоў М.І. Ганчарова, А.М. Кашкурэвіча (лінагравюра з серыі "Ab imo pectore"), У.І. Кухарава (7), самадзейнага мастака М. Налівайкі, скульптара У.В. Церабуна (2) і інш. да загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч. Пісьмо М.І. Ганчарова - са зваротам да "Міхаіла Фёдаравіча" і "калектыву рэдакцыі часопіса "Мастацтва Беларусі".<br>На Л. 6 - фота У.І. Кухарава (1986); на Лл. 23-24 - мастацкая паштоўка без аўтара (папера, змешаная тэхніка) (1986) | 1984-1990 | 24 | 16 | |
| 110 | Віншавальныя паштоўкі В.Целеша (Латвія) да В.А. Трыгубовіч | 1985-1987 | 6 | 4 | |
| 111 | Пісьмы А.М. Сланоўскай (Літва) (1986), Н.А. Грубе (дачкі скульптара А.В. Грубе) (1985), скарыназнаўцы Я.Л. Неміроўскага (1985) (Расія), мастака З.Ф. Мічкі (1988) і мастацтвазнаўцы А.К. Федарука (О.К. Федорука) (1988) (Украіна) да загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч (на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах).<br>На Л. 11 - фота габелена З.Ф. Мічкі "Пробуждение" (1987) | 1985-1988 | 14 | 6 | |
| 112 | Віншавальныя паштоўкі ад знаёмых да В.А. Трыгубовіч | [ад 1986 г.] - 1988 | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 113 | Паштоўкі і пісьмы Віцебскага аддзялення Саюза мастакоў БССР (1986), Народнага музея рэвалюцыйнай і баявой славы СШ № 4 імя П.І. Батава горада Слонім (1987) і інш. да загадчыка аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" В.А. Трыгубовіч па пытанні друку прадастаўленых матэрыялаў і інш.<br>На Лл. 2-7, 10-13 - артыкулы А.С. Жукоўскага "Прызнанне: дарыць людзям радасць" (аўтарызаваны машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай) (1987), Е.М. Кичина "Устремленность…" (аўтарызаваны машынапіс) (1986) і інш. | 1984-1987 | 18 | 10 | |
| | *** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 114 | Заява сябра Саюза мастакоў СССР Л.М. Лось у рэдакцыю "Мастацтва Беларусі" з просьбай разабрацца аб парадку налічэння пенсіі працуючым пенсіянерам-мастакам (з пазнакай: "В. Трыгубовіч падрыхтаваць ліст у СМ СССР да юрыста") і адказ на яе дырэктара Мастацкага фонду СССР А.Ф. Падкладкіна | 1984 | 2 | 2 | |
| 115 | Заява і зварот В.А. Трыгубовіч у аддзел культуры ЦК КПБ [і інш.] па пытанні пераразмеркавання сына ў дзіцячы садок па месцу жыхарства і інш. Чарнавікі | 1985, [1980-я гг.] | 3 | 2 | |
| | **4.2.2. ДАКУМЕНТЫ АБ ПРАЦЫ В.А. ТРЫГУБОВІЧ У ЧАСОПІСЕ "МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ"** | | | | |
| 116 | Дакументы аб падрыхтоўцы В.А. Трыгубовіч календара знамянальных і памятных дат па гісторыі мастацтва Беларусі на 1983 і 1984 гады (складзеныя календары, спісы юбіляраў-сяброў Саюза мастакоў БССР у 1983 і 1984 гадах, старонкі календара на 1984 год з біяграфіямі А.А. Уса і В.М. Ціхановіча) | | 25 | 9 | |
| 117 | Дакументы аб працы аддзела выяўленчага мастацтва часопіса "Мастацтва Беларусі" (кіраўнік В.А. Трыгубовіч) (пералік асноўных напрамкаў дзейнасці аддзела на 1987 год, план аддзела на 1988 год і інш.) | 1985-1988 | 10 | 5 | |
| 118 | Планы выставачнай дзейнасці Міністэрства культуры і Саюза мастакоў БССР на 1983 і 1984 гады, праграма навукова-метадычнага семінара "Проблемы совершенствования учебного процесса в среднем звене специального художественного образования (к вопросу о создании Республиканского научно-технического центра художественного образования при БГТХИ)" і інш. | 1983-1987 | 26 | 4 | |
| | **4.3. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ В.А. ТРЫГУБОВІЧ ПА ЦІКАВЫХ ТЭМАХ** | | | | |
| 119 | Нататка В.У. Вайцэхоўскай пра выставу "Современное изобразительное искусство Китая" ў Дзяржаўным мастацкім музее БССР, зварот-запрашэнне ў клуб "Спадчына" і інш. Аўтографы неўстаноўленых асоб, выразка з газеты, газета "Беларускі калекцыянер" (№ 2, 1991), друкаванае выданне "Belinga" (v/o "Byelorusintorg") | 1984-1991 | 10 | 5 | |
| 120 | Артыкулы, выступленне Ю. Туронка і інш. па праблеме нямецка-польскі адносінаў (на нямецкай | 1983-1991 | 119 | 34 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | і польскай мовах). Некаторыя - з перакладам В.А. Трыгубовіч з нямецкай мовы на рускую. Ксеракопіі з перыядычных выданняў, аўтограф В.А. Трыгубовіч, аўтарызаваны машынапіс Ю. Туронка | | | | |
| 121 | Артыкул Ю. Туронка аб праблемах каталіцызму на Беларусі і дыскусія вакол яго. "Пісьмо ў рэдакцыю" і інтэрв'ю Сакрата Яновіча карэспандэнтам месячніка "Gospodyni" і газеты "Trybuna" і інш. (на польскай мове). Выразкі і ксеракопіі з перыядычных выданняў, друкаванае выданне | 1990-1992 | 19 | 12 | |
| | *** | | | | |
| 122 | Адозвы і звароты да выбаршчыкаў у Вярхоўны Савет XII склікання (Беларусь), палітычныя ўлёткі рэферэндуму СССР і інш. Машынапіс, друкаваныя выданні, газета "Паритет" (за кастрычнік 1990 года) | 1990-1992 | 17 | 7 | |
| 123 | Дакументы Беларускага дэмакратычнага аб'яднання (Польшча) (праграма і статут, адозвы да выбаршчыкаў, бюлетэні і інш. (на беларускай, польскай і ўкраінскай мовах) | 1990-1991 | 51 | 8 | |
| | *** | | | | |
| 124 | Дакументы беларусаў ЗША (газеты "Беларус" (№ 382, верасень 1991 г., "Весткі й паведамленьні аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня" (15 сьнежня 1991 г. і 15 лютага 1992 г.), "Зважай" (лістапад 1987 г. і сакавік 1989 г.) і інш. (на англійскай і беларускай мовах) | 1983-1992 | 28 | 8 | |
| 125 | Афішы выстаўкі аб'яднання мастакоў беларусаў Балтыі "Маю гонар" (на беларускай і латышскай мовах) (Латвія) і фестывалю музыкі "Басовішча" (Польшча). Улётка мерапрыемства "Kunst aus Weissrussland" ("Мастацтва з Беларусі") (на нямецкай мове) (Германія) | 1990-1991 | 3 | 3 | |
| | *** | | | | |
| 126 | Л.С. Антимонов "Весенняя ночь". Каляровая манатыпія. Малюнак на рэлігійную тэму неўстаноўленага аўтара. Рэпрадукцыі | 1976, [1970-я - 1980-я гг.] | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 127 | Фатаграфія з адкрыцця неўстаноўленай выставы | [1980-я гг.] | 1 | 1 | |
| | **5. ДАКУМЕНТЫ І.Б. ЭЛЕНТУХА** | | | | |
| 128 | Паштоўка і пісьмы І.Б. Элентуха (2) і яго дачкі (Ізраіль) да Т.Б. Грушэцкай (Беларусь). На Лл. 9-10 нататка С. Рубінава "Молоко подорожало, масло тоже" і інш. (выразкі з газеты) (1993) | 1990-1993 | 15 | 5 | |

У дадзены вопіс унесена 128 (сто дваццаць восем)

спраў з № 1 па № 128 , 495 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку фонда зрабіла — Заг. аддзела В.Ф. Шаталава

Дакументы прынялі:

Заг. аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў ____________________ В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.